# ІКОНОПИС

**Флікоп Галіна**

## Іканастасы ўніяцкіх храмаў Беларусі XVII – пачатку XIX ст.: колькасць чыноў і іх змест

**Halina Flikop**
**The iconostasis of the Uniate churches in Belarus 17th - early 19th century: Number of ranks and their contents**
The article discusses the issue of the composition of the iconostasis of the Greek Catholic churches in Belarus. Identifies the most common types of structures that were typical for different regions. Examples of all the possible combinations of ranks in iconostasis, which was able to detect. The study is made on the basis of information from the visitation protocols Uniate churches of the late 17th - early 19th century from the archives of Belarus, Lithuania, Russia, Poland.
*Keywords:* Uniate iconostasis, ranks of iconostasis, the Greek-Catholic Church

**Галина Флікоп**
**Іконостаси уніатських храмів Білорусі XVII - початку XIX ст.: кількість чинів та їх зміст**
У артыкуле асвятляецца пытанне пра склад іканастасаў грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі. Выяўляюцца найбольш пашыраныя тыпы канструкцый, якія былі ўласцівы для розных рэгіёнаў. Прыводзяцца прыклады усіх магчымых варыянтаў спалучэння іканастасных чыноў, якія ўдалося выявіць. Даследаванне выканана на аснове звестак з пратаколаў візітацый уніяцкіх храмаў канца XVII – пачатку XIX ст. з архіваў Беларусі, Літвы, Расіі, Польшчы.
*Ключавыя словы:* ўніяцкі іканастас, іканастасны чын, грэка-каталіцкая царква

Адным з цікавых аспектаў у даследаванні грэка-каталіцкай царквы з’яўляецца пытанне пра склад іканастаў. Інакш кажучы – пра колькасць у ім чыноў і іх змест. Актуальнасць дадзенай тэмы для беларускага мастацтвазнаўства, гісторыі і культуралогіі тлумачыцца некалькі фактарамі. Перш за ўсё – нераспрацаванасцю праблемнага поля і адсутнасцю спецыяльных даследаванняў гэтага аспекта грэка-каталіцкай царквы. Па-другое, выяўленне характэрных рысаў уніяцкага

іканастаса дазволіць казаць пра яго падабенства або, наадварот, адрозненні да/ад праваслаўнага, што стане штуршком для далейшых даследаванняў у гэтай галіне і паспрыяе вызначэнню нацыянальных адметнасцяў мясцовых іканастасаў.

Дадзены артыкул хацелася б пачаць з цытаты вядомага беларускага даследчыка Ю.В. Хадыкі, які адносна гэтай праблематыкі даволі ёміста і лаканічна выказаў свае назіранні яшчэ ў пачатку 1990-ых гг., калі дадзеная тэма ў беларускім мастацтвазнаўстве толькі пачала вывучацца: «У ранні перыяд сваёй гісторыі унія ўплывае таксама на трансфармацыю іканастаса. Ёсць ускосныя сведчанні, што ў даўніяцкую эпоху беларускі іканастас меў дэісусны чын. Аднак унія рашуча замяняе яго чынам апостальскім, што істотна змяняе ідэалагічную праграму цэлага комплексу»[1]. Паводле меркаванняў навукоўцаў, апостальскі рад разам з абразамі, змешчанымі над Царскай Брамай «утвараў» крыжовы кампазіцыйны стрыжань і нёс асноўную сэнсавую і дэкаратыўную нагрузку»[2]. А. А. Ярашэвіч адзначае, што, як правіла, іканастасы мелі тры чыны: мясцовы, апостальскі і прарочы; праайцоўскі рад адсутнічаў або быў змяшаны з прарочым, а часам быў яшчэ і святочны чын[3].

Вывучэнне архіўных крыніц значнай колькасці грэка-каталіцкіх храмаў розных рэгіёнаў Беларусі дазваляе ўнесці пэўныя ўдакладненні ў прыведзеныя вышэй звесткі. Перш за ўсё гэта датычыцца колькасці і зместу чыноў. Сапраўды, калі іканастас быў больш, чым аднаярусны, дык у ім абавязкова (за вельмі рэдкім выключэннем, пра што размова пойдзе ніжэй) прысутнічаў апостальскі чын. Згадванне пра дэісусны рад, які быў уласцівы тагачасным рускім іканастасам і, магчыма, даўніяцкім беларускім, у візітацыйны актах (пратаколах праверак) ўніяцкай царквы канца XVII – пачатку XIX стст. не сустрэлася ніводнага разу.

Двух’ярусныя іканастасы, як правіла, характарызаваліся наступным чынам: «w gorze jest obraz Archiereia [...] obrazy SS. Apostołow»[4]. Часам пазначалася і колькасць абразоў: «w gurze ktorych 12tu Apostołow z Panem Jezusem»[5], - але далёка не заўсёды. На нашую думку, у большасці выпадкаў апостальскі чын быў поўным. Гэта было натуральнай з’явай, якая не вымагала дадатковага тлумачэння і апісання, таму візітатары пры занатоўванні звестак колькасць ікон Апосталаў не пазначалі. Часам былі і іншыя выпадкі, пра якія гаворка пойдзе пры разглядзе непасрэдна колькаснага складу і сюжэтнага зместу абразоў апостальскага яруса.

Наяўнасць абразоў Апосталаў для ўніяцкага храма была настолькі натуральнай, што пры адсутнасці такіх ікон візітатар часам рабіў адпаведны запіс. Так, у сухапольскай царкве Пружанскага дэканату ў 1725 г. «deisus nie porządny bez Apostołow», а пры гэтым у суседнім макранскім храме «deisus z apostołami pożądny»[6]. Такім чынам, пры адсутнасці гэтах абразоў іканастас успрымаўся непрыгожым, нязграбным.

Кажучы пра апостальскі чын, нельга не згадаць пра рэдкі выпадак, датычны іканастаса ў храме вёскі Пятровічы Мсціслаўскага дэканату (1822 г.). Тут выявы апосталаў былі размешчаны пад мясцовымі абразамі. Гэта ў дакуменце апісана наступным чынам: «Ikonostas o jedney kondygnacyi. W nim rzniętych 12 Apostołow, nad nimi 2 obraze namiestne z Drzwiami Carskiemi»[7]. Звяртаюць на сябе ўвагу два нюансы: размяшчэнне і тэхніка выканання. Тое, што выявы знаходзіліся пад мясцовымі іконамі, дазваляе весці гаворку пра так званы «цокальны» чын. Сустракаецца ён не часта, аднак такія выпадкі ў гісторыі мастацтва ўсё ж вядомыя: «Иногда в иконостас дополнительным чином ниже местного ряда включали изображения греческих мудрецов, предсказавших явление Христа (церковь в Останкино)»[8]. Хаця неабходна падкрэсліць, што размяшчэнне выяў Апосталаў ніжэй за мясцовыя абразы тут намі сустракаецца ўпершыню і па літаратурных звестках (а таксама па захаваных помніках) такія прыклады нам больш не вядомыя.

Па ўсёй верагоднасці, такое іх размяшчэнне тлумачыцца тэхнікай выканання – разьбой. Відавочна, што майстры-разьбяры выканалі іх у якасці дэкаратыўнага элементу ніжняй асновы іканастасу. Таму візітатарам гэтыя выявы і не апісаны як асобны чын, у адрозненне ад апостальскіх радоў у іншых храмах.

Адносна апостальскага чыну трэба адзначыць і яшчэ адну важную акалічнасць. Паводле меркавання даследчыкаў, наяўнасць гэтага яруса – рыса, характэрная менавіта для беларускіх іканастасаў, і з’явілася яна ў рэчышчы грэка-каталіцкай Царквы[9]. Аднак выяўленыя намі звесткі гавораць пра тое, што гэта не зусім так.

Па-першае, апостальскі чын замест дэісуснага прысутнічае і ва ўкраінскіх іканастасах грэка-каталіцкіх храмаў. Для разгляду мы бралі не памежныя з Беларуссю рэгіёны Украіны, а тыя, якія знаходзяцца на значнай адлегласці і ўваходзілі ў склад іншых даволі аддаленых епархій. Так, напрыклад, у Базалійскім дэканаце ў 1760 г. (цэнтр дэканату – Базалія – цяпер пасёлак гарадскога тыпу ў Тэафіпольскім раёне Хмяльніцкай вобласці) некалькі іканастасаў мелі апостальскі чын, а ў іншых выпадках пры апісанні досыць часта адзначаецца, што іканастас поўны, праўда звесткі пра яго склад не прыводзяцца. У Міжрэчыцкім дэканаце акрамя ікон Апосталаў згадваюцца яшчэ і Прарокі[10].

Такім чынам, наяўнасць апостальскага яруса – асаблівасць, уласцівая не толькі беларускім іканастасам. Магчыма, такі чын узнік у рэчышчы грэка-каталіцкай Царквы (пра гэта адзначалася Ю.В. Хадыкам) і быў характэрны як для беларускіх, так і для ўкраінскіх іканастасаў у храмах гэтай канфесіі. Аднак і гэта, на нашую думку, не зусім так. На жаль, мы не валодаем архіўнымі звесткамі пра беларускія праваслаўныя іканастасы даўніяцкага перыяду.

Ці быў там дэісусны чын і калі ён быў заменены на апостальскі – высветліць не прадстаўляецца магчымым. Аднак тут пэўнай крыніцай могуць выступаць візітацыйныя акты Тураўскай грэка-каталіцкай епархіі за 1777-1787 гг.[11].

Уніяцкая епархія на Тураўшчыне была ўтворана даволі позна – толькі ў сярэдзіне XVIII ст. Храмы з праваслаўя ў новую канфесію пераходзілі не ахвотна, а ў другой палове XVIII ст. часта бывалі выпадкі, калі цэлыя ўніяцкія парафіі вярталіся да ранейшага веравызнання. Гэтая акалічнасць сведчыць пра тое, што пад час знаходжання ў грэка-каталіцтве нутраное аблічча храма не мянялася, а таму складанасцяў з вяртаннем у праваслаўе не было[12]. Відавочна, што і на час візітацыі 1777 г. інтэр’еры храмаў захоўвалі свой аўтэнтычны выгляд, які быў сфармаваны яшчэ да пераходу ва ўніяцтва.

А гэта значыць, што апостальскі чын замест дэісуснага мелі яшчэ іканастасы беларускіх праваслаўных цэркваў. У які менавіта перыяд сфармавалася такая канструкцыя – не вядома. Магчыма і сапраўды першапачаткова апостальскі ярус замяніў сабой дэісусны ва ўніяцкіх храмах, а пасля такі тып іканастаса распаўсюдзіўся і на праваслаўныя беларускія цэрквы, якія існавалі поруч з грэка-каталіцкімі. Але на нашую думку, на канструкцыю іканастаса паўплывала не ўтварэнне новай канфесіі ў 1596 г., а нейкія іншыя фактары яшчэ ў даўніяцкі перыяд. Аднак на дадзены момант гістарычныя крыніцы, якія маглі б гэта пацвердзіць або абвергнуць, выявіць не ўдалося.

Трэба падкрэсліць, што хоць пераважная большасць двух’ярусных іканастасаў складалася з мясцовага і апостальскага чыноў, аднак былі і выключэнні. У некаторых храмах верхні ярус быў прадстаўлены іншымі абразамі. Так, нам вядомы два прыклады, калі над мясцовым чынам знаходзіўся прарочы. Такая канструкцыя была ў ставунскім храме Глускага дэканату ў 1792 г.[13] і ў гарадоцкім – Веліжскага у 1822 г.: «Jkonostas [...] z Carskiemi Drzwiami, namiesnemi obrazami i prorokami [...]»[14].

Вядомы таксама і некалькі прыкладаў, калі двух’ярусныя іканастасы складаліся з мясцовага і святочнага чыноў. Гэта датычыцца баханьскай царквы Рагачоўскага дэканату (1764 г.), дзе «deisus stolarskiey roboty obrazami większemi y mnieyszemi przyozdobiony taiemnice rożne wyrażaiącemi, obraz namiesny NayS.P: Maryi [...]» [15]. Тое ж самае можна адзначыць і пра бабіцкую філіяльную царкву (прыпісаную да васілевіцкай) Глускага дэканату (1792 г.), але ў дадзеным выпадку такі склад быў, па ўсёй верагоднасці, часовым, паколькі іканастас на момант візітацыі быў нясконачаны. Відавочна, ён меўся ўключыць і іншыя ярусы: «Konostas zaczęty z obrazami Prazdnicznemi ukonczonemi, y dwoma ołtzarami namiestnemi»[16].

Акрамя вышэй апісаных варыянтаў складу двух’яруснага іканастасу, вядомы і адзін выпадак, калі вярхні яго чын быў прадстаўлены пакутніцкім цыклам[17].

Гэтая з’ява ўяўляе сабой цікавы прыклад засвойвання ва ўніяцкім храме касцёльных нормаў: паводле каталіцкай традыцый на сценах бажніцы мусілі размяшчацца 14 выяў – так званыя «стацыі» – са сцэнамі ўзыходу Хрыста на Галгофу.

Вядомы таксама і прыклады, калі ў верхнім радзе змяшчаліся разрозненныя абразы розных сюжэтаў, якія не прадстаўлялі сабой поўны тэматычны чын. Такі склад іканастасаў зафіксаваны ў гістарычных дакументах другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. з апісаннямі Камянецкага, Задруцка-Рагачоўскага, Віцебскага, Веліжскага (па аднаму храму з такой канструкцыяй) Пухавіцкага, Мазырскага, Смалянскага (па два храмы), Кобрынскага, Веляшкоўскага (па тры храмы) дэканатаў[18]. Аднак найбольш шырока яны прадстаўлены ў паўднёвай частцы цэнтральнай Беларусі. Так, у Клецкім дэканаце ў 1784 г. зафіксавана пяць цэркваў з іканастасамі такога складу, а ў Глускім у 1791 г. – восем[19]. Але пры гэтым трэба адзначыць, што ў апісаннях Глускага дэканату за 1784 і 1792 гг. згадваюцца толькі па два двух’ярусныя іканастасы з разрозненнымі абразамі ў верхнім чыне[20].

Уцэлым трэба падкрэсліць, што з тых іканастасаў, склад якіх з архіўных крыніц вядомы, пераважная большасць належыць менавіта двух’ярусным. Праўда дакладна сцвярджаць пра прэваліраванне такіх канструкцый не магчыма па той прычыне, што значная колькасць іканастасаў у дакументах апісана не дакладна. Даволі часта адзначаецца проста яго наяўнасць, а колькасць чыноў застаецца не зафіксаванай. Таксама маецца і шмат прыкладаў, калі вядома, што іканастас быў больш, чым аднаярусны, аднак колькі і якія рады ён меў, – не ўказана.

Яшчэ раз падкрэслім, што сярод дакладна апісаных першае месца па распаўсюджанасці належыць двух’ярусным іканастасам. Наступнымі пасля іх ідуць трох’ярусныя. Апошнія, як правіла, складаліся з мясцовага, апостальскага і прарочага чыноў. Менавіта такая канструкцыя ў некаторых дакументах фігуруе з характарыстыкай «deisus cały». У прыватнасці гэта датычыцца візітацыйных актаў Мсціслаўскай дыяцэзіі за 1732-1736 гг., дзе большасць іканастасаў мела менавіта такі склад. Напрыклад, у візітацыйным акце залозскай царквы Божага Пераўтварэння адзначаецца што «dejsus cały», пасля чаго прыводзіцца больш падрабязнае апісанне, з якога вынікае, што ён складаецца з трох чыноў: мясцовага, апостальскага, прарочага[21].

Тое ж самае датычыцца і большасці астатніх цэркваў Мсціслаўскага і Горацкага дэканатаў, пра якія таксама даюцца такія ж характарыстыкі. Так, эпітэт «cały» фігуруе ў апісанні смалянскай, старасельскай, дзвюх галавачыцкіх цэркваў Мсціслаўскай дыяцэзіі. Пры чым усе гэтыя іканастасы былі трох’яруснымі і складаліся з мясцовага, апостальскага і прарочага чыноў. Такую канструкцыі

мелі і некаторыя іншыя іканастасы ў 1730-ыя гг. разглядаемай царкоўна-адміністрацыйнай адзінкі, аднак адносна іх не было адзначана ў дакументах, што ён «поўны», хаця гэта вынікае непасрэдна з пераліку чыноў.

Такім чынам, ужо на гэты час у грэка-каталіцкай Царве было сфармавана ўяўленне пра тое, якой мае быць іканасная канструкцыя: поўнай яна лічылася пры наяўнасці мясцовага, апостальскага і прарочага чыноў. І менавіта такой яна была ў большасці храмаў Мсціслаўскай дыяцэзіі.

Але трох'ярусныя іканастасы таксама не былі аднастайнымі. Зафіксавана некалькі прыкладаў, калі адзін рад замест абразоў Прарокаў складаўся з ікон Божых Святаў. Па аднаму храму з іканастасам такой канструкцыі было ў Рагачоўскім (1764 і 1784 гг.), Глускім (1784 г.), Цяцерынскім і Аршанскім (абодва – 1822 г.) дэканатах, і дзве царквы – у Петрыкаўскім (1777 г.)[22]. Праўда трэба адзначыць, што ў Аршанскім дэканаце – а гаворка ідзе пра царкву Св. Іллі ў в. Мошкаў – святочны чын быў прадстаўлены толькі адным абразом – «Пакровам Божай Маці», які змяшчаўся над абразамі Апосталаў[23]. Таму ў дадзеным выпадку нельга з пераканаўчасцю казаць, што ў мошкаўскай царкве быў трох'ярусны іканастас.

У Петрыкаўскім дэканаце, да прыкладу, іканастасы апісваюцца наступным чынам: «Ikonostas z apostołow 12, y archiereja y Praznikow, y namiesnych obrazow ustanowiony dawnieyszy» (царква Нараджэння Божай Маці ў в. Меляшквічы)[24]. У дадзеным выпадку, праўда, не вядома, які чын быў самым верхнім – апостальскі ці святочны. А вось апісанні царквы Св. Дзмітрыя ў в. Бяседкі таго ж дэканату дакладна дае ўяўлення пра паслядоўнасць ярусаў: «Na scienie frontowey Deisus […] jeszcze nieskończony, w ktorym w gorze obraz archyiereja, y trzech apostołow dopiero (: bo ieszcze inne nie są wyspiszone :) pod niemi obrazki niewielkie z wyobrażanemi Praznikami, na dole Drzwi Carskie y koło nich obrazy namiesne […]»[25].

З візіты Рагачоўскага дэканату 1764 г. таксама не зразумела паслядоўнасць апостальскага і святочнага чыноў. Так, іканастас залесскай царквы апісваецца наступным чынам: «Deisus stolarskiey roboty z obrazami większemi y mnieyszemi SS. Apostolow y insze Tajemnice Panskie […]»[26]. Прыклады захаваных іканастасаў (з в. Шарашова Пружанскага р-ну, цяпер – у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі) сведчаць пра тое, што святочны чын змяшчаўся пад апостальскім[27], а гэта ўсё ж дазваляе выказаць меркаванне, што ў мошкаўскай царкве Аршанскага дэканату абраз «Пакроў Божай Маці», уладкаваны ў самым версе, не прадстаўляў сабой ярус (хоць і вядомы прыклады, калі чын скаладаўся толькі з аднаго абраза).

У некаторых выпадках над апостальскім чынам змяшчаліся разрозненыя абразы розных сюжэтаў. Такія іканастасы зафіксаваны, паводле візітацыйных

актаў, у Пружанскім (1759 г.), Глускім (1784 і 1791 гг.) – па адным, Рагачоўскім (1784 г.) – два, Уладаўскім (1759 г.) – тры – дэканатах[28]. Напрыклад, пры апісанні царквы Апекі Божай Маці в. Славатычы Уладаўскага дэканату адзначаецца, што ў самым версе (над «Апосталамі») знаходзіцца выява «Спас Нерукатворны» і абразы розных святых[29].

Вядомы і адзін прыклад (у Бельскім дэканаце 1784 г.), калі ў трох'ярусным іканастасе не было ні «Апосталаў», ні «Прарокаў»: над мясцовым радам знаходзіўся святочны, а над ім – пакутніцкі цыкл. Гэта датычыцца царквы Узнясення Божага ў в. Клейнікі: «W drugiey kondygnacyi (мясцовы чын не ўлічваўся як ярус, адлік ішоў ад таго чына, які знаходзіўся над ім; у дадзеным выпадку – святочны: ён улічаны, як першы, а пакутніцкі – над ім – як другі) Pan Jezus Ukrzużowany z osobą rzniętą pomalowaną z figurą całey Męki Zbawiciela»[30].

Аднак яшчэ раз падкрэслім, што пераважная большасць іканастасаў у тры чыны складалася з мясцовых ікон, выяў Апосталаў і Прарокаў. Менавіта такія канструкцыі, паводле меркаванняў візітатараў, лічаліся поўнымі. Гэта сведчыць пра тое, што ў рэчышчы грэка-каталіцкай Царквы не проста быў выпрацаваны свой тып іканастаса, як адзначалася даследчыкамі, а гэта нават стала пэўнай нормай і своеасаблівым канонам (які, пры гэтым, не заўсёды выконваўся).

Высокія іканастасы ў чатыры і пяць чыноў для уніяцкіх храмаў – з'ява даволі рэдкая. Наяўнасць такіх канструкцый носіць хутчэй лакальны характар. Збольшага чатырох- і пяціярусныя іканастасы зафіксаваны на гістарычнай Тураўшчыне і прылеглых да яе землях напрыканцы XVIII ст. (чатырох'ярусныя: тры ва Убарцкім дэканаце, па адным у Петрыкаўскім і Мазырскім (1777 г.), восем у Глускім, два – у Рагачоўскім (1792 г.); пяціярусны: адзін ва Убарцкім дэканаце)[31]. Пра асаблівасці гэтага рэгіёну гаворка вялася вышэй. Верагодна, высокія іканастасы Тураўскай Епархіі ў храмах з'явіліся яшчэ за праваслаўным часам, а пасля пераводу цэркваў ва Унію так і працягвалі там існаваць.

Другім месцам, дзе зафіксаваны такія канструкцыі, з'яўляецца Полацкая Епархія напачатку XIX ст. На жаль, па гэтым рэгіёне больш ранніх дакументаў амаль няма, таму не магчыма высветліць перыяд з'яўлення тут высокіх іканастасаў. Аднак у 1822 г. у некалькіх храмах епархіі згадваюцца чатырох'ярусныя іканастасы[32]. Магчыма, іх узнікненне акурат і прыпадае на пачатак XIX ст., калі нашыя землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, і звязана з уплывам праваслаўных рускіх іканастасаў, якія, як правіла, мелі шмат чыноў.

Але, верагодна, гэта тлумачыцца эканамічна-побытавымі фактарамі. Напрыклад, у трох Віцебскіх храмах знаходзіліся высокія іканастасы (адзін чатырох'ярусны і два пяціярусных). Віцебск на той час з'яўляўся губернскім горадам. Агульны ўзровень дабрабыту і заможнасць гараджан, якія з'яўляліся парафіянамі храмаў, маглі на прамую паўплываць

на абсталяванне сакральнага інтэр’еру. Таксама нельга абмінаць увагай і тую акалічнасць, што ў такім значным населеным пункце, безумоўна, былі майстры адпаведнай кваліфікацыі, якія маглі якасна выканаць і разьбяную аснову, і абразы.

Яшчэ адной прычынай усталявання высокіх іканастасаў магла быць агульнай вялікая ўнутраная прастора храма. Відавочна, што ў значных населеных пунктах, якім з’яўляўляўся Віцебск, а таксама вёскі на Палессі спрадвеку былі вялікімі, будавалі і адпаведныя бажніцы, якія б маглі змясціць шматстайную колькасць вернікаў. Вялікага памеру храм вымагаў усталявання і адпаведнай велічыні іканастасу. На велічыню царквы (а дапаведна – і іканастасу) маглі ўплываць не толькі памеры населенага пункта і колькасць парафіянаў, але і лакальныя будаўнічыя традыцыі.

Чатырох’ярусныя іканастасы, апісаныя ў візітацыйных актах, былі даволі разнастайнымі паводле свайго складу. Найбольш распаўсюджанымі сярод іх былі «традыцыйныя канструкцыі», якія змяшчалі мясцовы, святочны, апостальскі і прарочы чыны. Былі і лакальныя варыянты. Так, у чатырох храмах Глускага дэканату ў 1792 г. у верхнім ярусе былі змяшаны іконы Прарокаў і Прайцоў[33] (пра сумяшчэнне ў адным радзе абразоў з двух названых цыклаў адзначаў А. А. Ярашэвіч[34]).

Сустракаюцца чатырох’ярусныя іканастасы і іншага складу. Так, вядомы некалькі прыкладаў, калі замест святочнага быў пакутніцкі чын[35]. У візітацыйных актах зафіксаваны і іншыя тыпы іканастаса з пасійнымі цыкламі. Так, у Дабравешчанскай цэркве Віцебска ў 1822 г. чатырох’ярусны іканастас складаўся з мясцовага, апостальскага, пакутніцкага чыноў, у самым версе над якімі знаходзіліся выявы Евангелістаў[36]. А ўТроіцкай цаокве мястэчка Клічаў Ігуменскага дэканту ў 1823 г. меўся іканастас падобнай канструкцыі, але верхні яго чын быў прадстаўлены не Евангелістамі, а абразамі святочнага цыклу[37].

У некаторых выпадках склад не зафіксаваны, а ў дакументах проста адзначана, што «deisus w cztery kondygnacyje». Тое ж датычыцца і нешматлікіх пяціярусных іканастасаў. Толькі ў адным выпадку вядомы яго склад: у віцебскай царкве Яна Евангеліста іканастас складаўся з мясцовага, апостальскага, прарочага, пакутніцкага і праайцоўскага чыноў (апошні быў прадстаўлены толькі адным абразом з выявай «Саваофа»)[38].

З характарыстыкай «высокі» згадваюцца тры іканастасы ў Рагачоўскім і адзін у Гомельскім дэканаце ў 1822 г. На жаль, не зразумела, што пад гэтым мае на ўвазе візітатар. Магчыма гэта былі іканастасы ў чатыры ці пяць чыноў, аднак, верагодна, што яны маглі быць і трох’яруснымі. Увогуле, у гэтым дакуменце колькасць радоў не згадваецца ніводнага разу. Пры апісанні іканастаса прыводзяцца характарыстыкі «высокі» або «нізкі»[39].

А вось як раз апошнія з названых («нізкія») былі даволі распаўсюджанымі ва ўніяцкіх храмах. Іканастасы ў адзін чын зафіксаваны ў розных рэгіёнах і ў розныя перыяды існавання грэка-каталіцкай Царквы і іх колькасць прыблізна такая ж, як і трох'ярусных. Большасць з іх сустракаецца на Брэстчыне. Увогуле для гэтага рэгіёну ўласцівы невысокія канструкцыі: як правіла, у адзін-два рады[40].

Такім чынам, найчасцей ва ўніяцкіх храмах былі нізкія канструкцыі. Чатырох' – і пяціярусныя сустракаюцца даволі рэдка. Поўным лічыўся іканастас у тры чыны: мясцовы, апостальскі, прарочы. Такія канструкцыі зафіксаваны ў розных рэгіёнах і ў розныя перыяды. Аднак па колькасці ўзгадванняў у візітацыйных актах іх пераўзыходзяць двух'ярусныя іканастасы з мясцовым і апостальскім радамі. Таксама вельмі пашыранымі былі і аднаярусныя, гэта ў нейкім сэнсе абвяргае меркаванне даследчыкаў пра тое, што «беларускі іканастас вызначаўся пэўнымі асаблівасцямі: колькасць радоў 3-4 […]»[41], бо часцей ён усё ж быў двух-трох'ярусным.

Большасць чатырох' – і пяціярусных іканастасаў зафіксавана менавіта ў Тураўскай епархіі. Тут жа даволі высокі працэнт быў і іканастасаў у тры чыны. Менавіта трох'ярусныя былі найбольш пашыранымі і на ўсходзе Беларусі.

Нізкія канструкцыі часцей сустракаюцца ў храмах Брэсцкай дыяцэзіі ў сярэдзіне XVIII ст. Для гэтага рэгіёну ўласцівы значны працэнт захаванасці іканастасаў, якія, як правіла, былі ў адзін-два чыны. Хаця, Двух'ярусныя іканастасы, як ужо адзначалася, былі самымі распаўсюджанымі і сустракаюцца ў розных рэгіёнах. Акрамя таго, яны займалі прэвалюючыя пазіцыі ў Глускім, Рагачоўскім, Бабруйскім, Пухавіцкім дэканатах.

Такім чынам, іканастасы ў беларускіх грэка-каталіцкіх храмах былі рознай вышыні, аднак найбольш характэрнымі і пашыранымі з'яўляюцца ў 1-3 чыны.

Іканастасы ўніяцкіх храмаў вылучаюцца разнастайнасцю не толькі па колькасці чыноў: ад аднаго да пяці, але і па іх зместу. Паводле нашых падлікаў, у грэка-каталіцкіх цэрквах Беларусі іканастасы былі прадстаўлены 17 разнастайнымі варыянтамі складу. Так, двух'ярусныя ўверсе маглі мець апостальскі, прарочы, пакутніцкі або святочны чын ці змяшчалі там разрозненыя абразы.

Іканастасы ў тры чыны маглі мець наступны склад: мясцовы + апостальскі + прарочы (лічыўся поўным іканастасам); мясцовы + святочны + апостальскі; мясцовы + апостальскі + разнастайныя іконы; мясцовы + святочны + пакутніцкі.

Чатырох'ярусныя зафіксаваны такіх варыянтаў: мясцовы + апостальскі + святочны + прарочы; мясцовы + апостальскі + пакутніцкі + прарочы; мясцовы +

апостальскі + пакутніцкі + абразы Евангелістаў; мясцовы + апостальскі + пакутніцкі + святочны; мясцовы + апостальскі + святочны + выявы Прарокаў і Праайцоў.

Іканастасы ў пяць чыноў сустрэліся нам двух канструкцый. Уверсе над чатырма ярусамі: мясцовым, апостальскім, пакутніцкім, прарочым – у адным выпадку быў святочны рад, у другім – праайцоўскі.

Такім чынам, уніяцкі іканастас вызначаўся сваёй разнастайнасцю паводле сюжэтна-тэматычнага зместу чыноў і іх колькаснага складу. Аднак найбольш распаўсюджанымі былі аднаярусныя, двух'ярусныя іканастасы з мясцовым і апостальскім радамі, трох'ярусныя – з мясцовым, апостальскім і прарочым.

[1] Хадыка, А.Ю., Хадыка, Ю.В. Рэнесанс у беларускім новым іканапісе // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 69.

[2] Ярашэвіч, А.А. Іканастас // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 126.

[3] Тамсама.

[4] Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – ЛДГА). – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр.48. – Wizyja generalna Prużańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów. – 1759. – С. 367.

[5] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). - Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41241. – Akt Wizyty g[enie]r[a]lney dekanatow Bobruyskiego, Hłuskiego y Rohaczewskiego– 1784. – Арк. 46.

[6] Дзяржаўны архіў у Любліне. – Холмская грэка-каталіцкая кансісторыя. – Спр. 101. – Wizytacje parafii diecezji chelmskiej i brzeskiej. – 1725–1727. – Арк. 126 адг.

[7] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей – РДГА). – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 182. – Wizyty dekanatów Mscisławskiego, Zapolańskiego i Zasożskiego protopresbyteryi Mscisławskiey za rok 1822. – 1822. – Арк. 52-52 адг.

[8] Классический пятиярусный иконостас, его устройство и история развития. – [электронны рэсурс]. – дата доступу: 26.12.2014. – рэжым доступу http://pokrovchram.ru/istoriya_razvitiya_klassicheskogo_i.

[9] Хадыка, А.Ю., Хадыка, Ю.В. – С. 69.

[10] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1 – Спр. 49. – Rewizyie cerkwiy wszystkich w Dekanacie Bazaliyskim…– 1760. – [47] арк. ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 2. – Спр. 663. – Wizyty dekanatu Międzyrzyckigo... – 1755. – [14] арк.

[11] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр.41240. – [Візіты Тураўскага, Убарцкага, Мазырскага, Петрыкаўскага дэканатаў Тураўскай епархіі]. – 1777-1787. – [284] арк.

[12] Лісейчыкаў, Дз.В. Уніяцкія парафіі «Тураўскай епархіі» ў XVI - XVIII ст. – [электронны рэсурс]: Рэжым доступу – http://niab.belhost.by/stat/lisejczyk_turaw/. – Дата доступу 20.10.2011.

[13] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 1. – Akt wizyty generalney surrogacyi Poleskiey dekanatu Hłuskiego. – 1792. – Арк. 15 адг.

[14] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. – Wizyty dekanatów: Witebskiego, Wieliżskiego, Wielaszkowskiego, Mikulinskiego i Zadz'wińsko-Bieszenkowskiego za rok 1822. – 1822. – Арк. 90.

[15] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41278. – [Візіты Рагачоўскага дэканата]. – 1764. – Арк. 27 адг.

[16] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 15.

[17] Флікоп, Г.А. Мастацкія і іканаграфічныя асаблівасці іканапісу грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII — першай паловы XIX стагоддзяў: дысертацыя на саісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства: спецыяльнасць 17.00.04 Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура. – Мінск, 2014. – С. 279.

[18] Флікоп, Г.А., с. 280.

[19] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 2. – Księga wizyt rocznych dekanatu Hłuskiego. – 1791; НГАБ. – Ф. 3245. – Воп. 7. – Спр. 3. – [Візіты Клецкага і Нясвіжскага дэканатаў]. – 1784.

[20] Флікоп, Г.А., с. 280.

[21] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей – РДГА). – Ф. 823. – Воп. 3. – Спр. 519. – Protokoł wizyt diecezyi Mscisławskiey. – 1732-1736. – Арк. 22.

[22] Флікоп, Г.А. Мастацкія і іканаграфічныя асаблівасці іканапісу … С. 280.

[23] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 185. – Wizyty dekanatu Smolańskiego i Orszańskiego. – 1822. – Арк. 74.

[24] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41240. – Арк. 52 адг.

[25] Тамсама. – Арк. 38

[26] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41278. – [Візіты Рагачоўскага дэканата]. – 1764. – Арк. 10

[27] Іканапіс Беларусі XV – XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 2001. – № 130.

[28] Флікоп Г. А. – С. 281.

[29] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. – С. 383.

[30] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 51. – Akta wizytacyj cerkwi dekanatu Bielskiego. – 1784г. – Арк. 31 адг.

[31] Флікоп Г. А. – С. 281-282.

[32] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410.

[33] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 1.

[34] Ярашэвіч, А. А. – С. 126.

[35] Флікоп Г. А. – С. 282.

[36] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. – Арк. 28-29

[37] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41262. – Akta Wizyt dekanatu Jhumeńskiego z Roku 1823. – 1823. – Арк. 150.

[38] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. – Арк. 8-8 адг.

[39] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 184. – Wizyty dekanatow Rohaczewskiego i Homelskiego za rok 1822. – 1822. – [171] арк.

[40] Флікоп Г. А. – С. 278.

[41] Ярашэвіч А. А. – С. 126.